## ПРАМОВА СТАРШЫНІ СОЎНАРКОМА БССР

# тав. М. М. ГАЛАДЗЕДА

Беларускі народ на стыку двух светаў толькі што аднагалосна прагаласаваў і паслаў свой рапарт, сваё пісьмо-паэму таварышу Сталіну. У гэтым сваім рапарце працоўныя масы Беларусі даюць сваю справаздачу ўсім народам нашага вялікага СССР аб барацьбе за сацыялізм, рапартуюць аб тым, як беларускі народ пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і вялікага Сталіна заваяваў сабе сваю беларускую совецкую дзяржаўнасць.

Пры царызме былі беларусы, але не было Беларусі. Рускі царызм бязлітасна душыў усякае праяўленне нацыянальнай самасвядомасці і нацыянальна-рэволюцыйнага руху, нават сама назва «Беларусь» вытраўлялася царскім урадам.

Толькі вялікая Кастрычніцкая рэволюцыя 1917 года прынесла працоўным масам Беларусі, як і ўсім народам СССР, сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. Ад Кастрычніцкай рэволюцыі бярэ свой пачатак і беларуская дзяржаўнасць.

Беларускую рэспубліку арганізавалі большэвікі. 30 снежня 1918 года заходняя абласная канферэнцыя большэвікоў па ініцыятыве таварыша Сталіна і па яго непасрэднаму ўказанню абвясціла Беларусь самастойнай Совецкай Социялістычнай Рэспублікай, а канферэнцыя была перайменавана ў першы з'езд комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі. Адсюль і пачынаецца беларуская дзяржаўнасць.

А наш правадыр і настаўнік вялікі Сталін з'яўляецца тварцом і стваральнікам Беларускай ССР.

У дзень святкавання XVI гадавіны вызвалення Беларусі ад белапольскай акупацыі нельга не ўспомніць аб жудасных старонках белапольскага панавання ў 1919 — 20 годзе. Крывёю прапітаны старонкі з гісторыі польскай акупацыі. Жудаснымі былі часы панавання акупантаў на Беларусі. У першы-ж дзень шая чэлядзь — хадзілі на паклон да Пілсудскага, выказвалі яму свае пачуцці і выражалі надзею на тое, што ім будзе даравана буржуазная «Народная» рэспубліка. Яны — гэтыя беларускія нацыяналісты — служылі малебны ў цэрквах за польскіх грабежнікаў. Яны прадавалі беларускі народ оптам і ў розніцу спачатку кайзеру нямецкаму, а потым польскім ваяводам.

Белапольскія акупанты за 11 месяцаў свайго панавання ў акупаванай Беларусі цалкам і поўнасцю аднавілі парадкі Нікалая II, карыстаючыся металамі, узятымі з яго арсенала. Яны нават перашчагалялі царызм і за кароткі час свайго панавання на Беларусі заслужылі сабе славу «еўрапейскага жандара».

Але рабочыя і сяляне Беларусі, ідучы за большэвіцкай партыяй, ідучы за Леніным і Сталіным, на дзікія расправы польскіх паноў адказалі аб'яднаннем сваіх сіл, арганізацыяй партызанскіх атрадаў. На распальванне нацыянальнай варожасці працоўныя Беларусі адказалі аб'яднаннем працоўных усіх нацыянальнасцей — беларусаў, яўрэяў, палякаў, рускіх, літоўцаў, латышоў і іншых. Яны ўзмацнілі брацкі саюз усіх народаў, усё вышэй і вышэй узнімаючы сцяг пролетарскага інтэрнацыяналізма і над гэтым штандарам пролетарскага інтэрнацыяналізма, пад кіраўніцтвам слаўнай большэвіцкай партыі перамаглі сваіх ворагаў канчаткова.

Беларускія рабочыя і сяляне аказалі ўсебаковае падтрыманне нашай слаўнай Чырвонай арміі, дапамаглі ёй разграміць агентаў Антанты — польскіх акупантаў.

Нашы перамогі над польскімі акупантамі звязаны з імем вялікага маршала сацыялістычнай рэволюцыі — з імем таварыша Сталіна, які кіраваў паўднёва-заходнім і заходнім франтамі ў барацьбе супроць інтэрвентаў.

Яны, перамогі нашы, звязаны з імем вялікага палкаводца Чырвонай арміі, з імем таварыша Варашылава. Разгортваючы наступленне на цыянальных рэспублік і абласцей СССР.

Найбольш ярка выступаюць нашы поспехі ў справе карэннай перабудовы беларускай вёскі.

Назаўсёды адышла ў нябыт вёска галечы, голаду, нечуванай панскай кабалы, вёска каўтуна, курнай хаты, вёска панскага быдла, вёска сахі і пералажнай сістэмы. І беларускія сяляне, уступіўшы ў калгасы, ужо ўзняліся на ўзровень культурных і заможных людзей, на ўзровень актыўных удзельнікаў сацыялістычнага будаўніцтва. Яны з поспехам падымаюць ураджай калгасных палёў, развіваюць сацыялістычную жывёлагадоўлю, разгортваюць новую калгасную культуру. На палях беларускіх калгасаў і соўгасаў к 16-ай гадавіне вызвалення БССР ад белапалякаў працуе больш 6.000 трактараў, створана 120 МТС. На змену сахі прыйшлі складаныя машыны. Калгаснікі Беларусі з поспехам вядуць барацьбу за лён, за павышэнне яго ураджайнасці, за якасць ільновалакна, вядуць барацьбу за пшаніцу, за высокі яе ўраджай. Не пакладаючы рук яны працуюць над пашырэннем пасеўных плошчаў калгасных палёў.

Вырасла сетка школ, дамоў соцыялістычнай культуры, хат-лабараторый, медыцынскіх устаноў, універсітэтаў, навуковых устаноў і т. д. Бурна расце беларуская літаратура і мастацтва. Выраслі тысячныя кадры людзей з карэннай беларускай нацыянальнасці.

Загнаны ў мінулым беларускі народ, падняты Кастрычніцкай рэволюцыяй, народ, які вядзе наша слаўная большэвіцкая партыя і геніяльны правадыр усіх народаў таварыш Сталін, пры штодзенным падтрыманні і шырокай дапамозе працоўных усяго Саюза ССР, у першую чаргу пры дапамозе рускага народу, — вырас у сапраўднага тварца новай сацыялістычнай культуры, культуры матэрыяльнай і духоўнай. Нашым магутным ростам мы абавязаны Цэнтральнаму Камітэту ВКП(б) і вялікаму Сталіну, які сваёй клапатлівай рукой, як родны

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы